# Засумавалі па чыгуначных паездках

**За першы месяц курсіравання фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква перавёз больш за 16,5 тысячы пасажыраў.**

Пры гэтым у зносінах Мінск — Масква перавезена каля 9 тысяч пасажыраў, запаўняльнасць саставу склала амаль 100 працэнтаў. У адваротным кірунку — больш за 7,6 тысячы грамадзян, запаўняльнасць саставу — каля 90 працэнтаў, паведаміў прэс-цэнтр магістралі.

Нагадаем, што міжнародныя пасажырскія зносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй у адпаведнасці з рашэннем урада Расійскай Федэрацыі аднаўлены з 0.00 гадзін 8 лютага. Першым цягніком, які адправіўся з Беларусі ў Расію пасля 10-месячнага перапынку, стаў фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква фарміравання БЧ.

У цяперашні час ён адпраўляецца з Мінска па цотных, а з Масквы па няцотных днях і робіць падчас руху прыпынкі для пасадкі/высадкі пасажыраў на станцыях Орша-Цэнтральная, Смаленск і Вязьма.

Усяго з моманту адкрыцця продажу праязных дакументаў (4 лютага) на цягнікі ў зносінах з Расійскай Федэрацыяй рэалізавана ўжо больш за 43 тысячы квіткоў. З іх амаль 65 працэнтаў ці 28,4 тысячы праязных дакументаў — на фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква.

На магістралі ў чарговы раз звярнулі ўвагу, што ў цяперашні час праезд у зносінах Мінск — Масква — Мінск магчымы толькі для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Акрамя таго, з улікам бягучай эпідэмічнай сітуацыі Беларуская чыгунка рэкамендуе пасажырам пры набыцці праязных дакументаў больш актыўна выкарыстоўваць электронныя каналы продажаў: афіцыйная мабільная праграма Беларускай чыгункі «БЧ. Мой цягнік» і абноўлены раздзел «Паслугі пасажырам» на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі (pass .rw. by). Рэалізацыя праязных дакументаў на міжнародныя пасажырскія цягнікі вядзецца за 60 сутак да іх адпраўлення.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**